View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# АЗНАЯМЛЕННЕ З МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРАЙ ДЗЯЦЕЙ МАЛОДШАГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

**Д.М. Дубініна**

Дзяцей ад 3 да 4 гадоў з вялікай сілай цягне да рытмізаваных і рыфмаваных радкоў: “рытмічнага гучання вершаў, казак, бадзёрага скандзіравання лічылак і заклічак”. Яны с задавальненнем слухаюць невялікія забаўлянкі, заклічкі, вершыкі, песенькі. Дзеці гэтага ўзросту, спасцігаючы невялікія па аб’ёме вершаваныя творы, дакранаюцца да багацця роднай беларускай мовы, набываюць свой першы літаратурны вопыт.

Народная педагогіка цесна злучыла ў адзінае цэлае мастацкае слова і канкрэтныя дзеянні, якія адпавядаюць зместу твора. Расказваць такія малыя шэдэўры вуснай народнай творчасці, як "Сарока-варона», «Ладачкі», «Кую-кую ножку» «Курачка-рабушэчка» немагчыма без выканання пэўных рухаў: згінанне і выпростванне пальцаў, пляскане ў далонькі, пастукванне пальчыкам на назе, качанне.

Некаторыя малыя фальклорныя формы, вершыкі беларускіх пісьменнікаў завучваюцца дзеткамі напамяць. Завучванне вершаў дапамагае дашкольнікам адчуць мелодыю гучання мастацкага слова. Тут неабходна асобна адзначыць фактары, якія, на думку А.Г. Жукоўскай, аказваюць уплыў на ўспрыманне вершаваных тораў дзецьмі. Гэта – цікавасць да зместу твора; блізкасць зместа вершаў дзіцячым інтарэсам, індывідуальнаму густу; выразнае чытанне верша дарослымі; сістэматычнасць вершаванага выхавання; авалоданне дзецьмі спосабамі запамінання.

Для дзяцей ад 3 да 4 гадоў падбіраюцца вершы, невялікія па аб'ёме (1 - 2 радкі), блізкія і даступныя па змесце, рытмічныя. Яны, як правіла, абавязкова маюць музычную рыфму, перадаюць вызначанае дзеянне.

У пласт дзіцячага чытання дзяцей гэтага ўзросту таксама ўваходзяць беларускія народныя казкі, якія можна прапаноўваць малым у розных апрацоўках. Пасля расказвання казкі пажадана ўдакладніць як яна называецца, хто спадабаўся дзеткам ў казцы і чаму. Дарослы можа паведаміць хто ў гэтай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

казцы спадабаўся ці не спадабаўся менавіта яму і растлумачыць чаму ён так лічыць. Поспех зносін па змесце мастацкага твора залежыць ад таго, наколькі актыўна дзіця пойдзе на ўзаемны кантакт з дарослым.

Чытаць дзеткам творы беларускіх пісьменнікаў пажадана кожны дзень. Змястоўныя зносіны па мастацкім творы не павінны займаць шмат часу. Асноўнае месца ў іх займаюць пытанні, якія прапануюцца дзеткам падчас знаёмства з мастацкім творам. Пры гэтым пажадана як мага часцей выкарыстоўваць такі прыём, як паўторнае чытанне. Гэта неабходна рабіць дзеля таго, каб ў памяці дзяцей застаўся змест мастацкага твора, а не гутарка адносна гэтага зместу.

Для дзяцей ад 3 да 4 гадоў характэрна актыўнае ўспрыманне ілюстрацыі. Яны імкнуцца паказаць тыя дзеянні і рухі персанажаў, якія адлюстраваны на малюнку. Менавіта таму для чытання бяруцца кніжкі-малюнкі. Малым нават можна прапанаваць паставіць сябе на месца дзеючага персанажа ілюстрацыі. Калі дзіця такім чынам "ўваходзіць" ў змест ілюстрацыі, ён у далейшым з вялікай зацікаўленасцю пачынае распавядаць "аб самім сабе".

Творы для чытання і расказвання дзецям.

Тэма. Знаёмства з творамі фальклору

*Расказванне забаўлянкі "Ягорачка"*

*Расказванне забаўлянкі "Іграў я на дудцы"*

*Расказванне забаўлянкі "Кую кую ножку»*

*Расказванне забаўлянкі "Ой бычок, мой бысенька"*

*Расказванне казкі "Курачка-Рабка"*

*Расказванне казкі "Пчала і муха"*

*Расказванне казкі "Муха-пяюха"*

*Расказванне казкі "Зайкава хатка"*

*Расказванне казкі "Коцік, пеўнік і лісіца"*

Тэма. Поры года

*Завучванне верша В. Рабкевіча "Едзе восень"*

*Расказванне верша Я. Журбы " Дзед-Мароз"*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Завучванне верша  Я. Журбы “Першыя сняжынкі”.*

*Завучванне верша  С. Сокалава-Воюша “Елка”*

*Чытанне апавядання Ул. Юрэвіча “ Бярозчыны валёнкі”*

*Завучванне верша Т. Кляшторнай “ Шпак”*

*Завучванне верша Т. Кляшторнай “Дождж ык”*

Тэма. Нашы гульні і забавы

*Расказванне верша Т. Кляшторнай  “Паўцякалі цацкі”*

*Расказванне верша С. Сокалава–Воюша “Алоўкі ”*

Тэма. Мая сям’я

*Завучванне верша Т. Кляшторнай  “Ветлівыя словы”*

*Расказванне верша Э. Агняцвет “Маме”*

Тэма. Абаронцы Айчыны

*Расказванне верша Л. Рашкоўскага “ Я хачу салдатам стаць”*

Тэма: Звяры нашага лесу.

*Расказванне верша У. Луцэвіч “ Вожык”*

*Чытанне апавядання Янка Брыля “Жыў-быў вожык”*

Тэма. Родная старонка

*Завучванне верша С. Сокалава–Воюша “ Блакіт нябес”*

*Завучванне верша А. Бадака “ Беларусачка”*

Тэма. «Жывёлы»

*Расказванне верша А. Бадака  “Мышка”*

Тэма. Хатнія птушкі

*Расказванне вершаў Я. Коласа “Храбры певень”.*

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Беларуская дзіцячая літаратура. Хрэстаматыя / Аўт.- ўклад. М. Ф. Шаўлоўская. – Мн.: 2003.
2. Вітка В. Урокі роднага слова: Вершы, казкі, апавяданні: Для мал. Шк. Узросту / В. Вітка; Уклад. Т. С. Тарасава; -- Мн.: 2001.
3. Залатыя каласкі. Чытанка для дзяцей. Ч. 1; Ч. 2;  / Пад рэд. С.С. Лаўшука.—Мн.: 1994.
4.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Чытанка для дзіцячага сада / Уклад. В.Р. Вячорка і інш.,-- Мн.: 1990.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ